ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (1006) ● ЧАЦВЕР, 15 сакавіка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА
ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні тав. СЦЯПАНАВА В. І. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць і у сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць загадчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларускай ССР Сцяпанава Васілія Іванавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. СУРГАНАЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.**

12 сакавіка 1973 года.
Гор. Мінск.

## ПАЧЫН ПАДТРЫМАН

Камсамольцы і моладзь універсітэта горача падтрымалі пачын перадавых брыгад Маскоўскага аўтазавода імя Ліхачова—правесці 21 красавіка камуністычны суботнік.

Студэнты ўсіх факультэтаў аднадушны ў сваім жаданні ўнесці свой уклад у агульнанародную камуністычную працу, і справа цяпер за тым, каб вызначыць аб'екты работы, найбольш эфектыўна выкарыстаць у гэты дзень студэнцкія сілы.

М. МАЦЕЙКА.

# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

## ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК СЯРОД СТУДЭНТАЎ НА ДРУГОЕ ПАЎГОДДЗЕ 1972—1973 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

### *ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА І ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ*

1. Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях палітычнага і эканамічнага жыцця ўнутры краіны і рэспублікі (2—3 разы ў месяц).
2. Непарушнае адзінства і брацкая дружба народаў СССР — вялікая заваёва сацыялізму, крыніца новых перамог у камуністычным будаўніцтве.
3. Дзейнасць партыі і народа па выкананню праграмы эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны, распрацаванай XXIV з'ездам КПСС.
4. Партыя Леніна — арганізуючая і накіроўваючая сіла Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (да 70-годдзя ўтварэння КПСС).
5. 1973 год — рашаючы год дзевятай пяцігодкі.
6. Савецкая Армія—надзейная апора сацыялістычнай Радзімы, гарантыя мірнай працы савецкага народа.

### *ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ*

1. XXIV з'езд КПСС аб фарміраванні марксісцка-ленінскага светапогляду, выхаванні ідэйнай перакананасці і адданасці камуністычным ідэалам як сэрцавіне ўсёй ідэйна-выхаваўчай работы партыі.
2. Савецкі характар жыцця.
3. Ідэйнае і маральнае аблічча савецкага чалавека.
4. Сацыялістычны калектыў і маральнае выхаванне.
5. Выхаванне сацыялістычнага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму — важнейшая маральна-эстэтычная задача камуністычнага выхавання працоўных.
6. Бескампрамісная барацьба супраць перажыткаў мінулага ў свядомасці і паводзінах людзей — неабходная ўмова культурнага развіцця асобы.

### *ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ*

1. Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях міжнароднага жыцця (2—3 разы ў месяц).
2. Савецкі Саюз — надзейная апора ў барацьбе народаў за мір, нацыянальную незалежнасць і сацыялізм.
3. СССР і брацкія сацыялістычныя краіны ў барацьбе за ўсеагульнае і поўнае раззбраенне.
4. Выдатныя перамогі гераічнага народа В'етнама.
5. Краіна Саветаў вачыма сяброў.
6. Мілітарызм — параджэнне імперыялізму.

**ПАРТКОМ.**

# ПРЫСВОЕНА ВУЧОНАЕ ЗВАННЕ

З пачатку 1973 года ў сакратарыят вучонага савета БДУ паступілі паведамленні аб прысваенні вучонага звання дацэнта:

**Гарошку** Мікалаю Мікалаевічу (кафедра неарганічнай хіміі)

**Шубінай** Людміле Васільеўне і

**Сакалову** Мікалаю Андрэевічу (кафедра арганічнай хіміі)

**Петачэнку** Міхаілу Рыгоравічу (кафедра тэорыі дзяржавы і права)

**Яновіч** Алене Іванаўне (кафедра рускай мовы).

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ Ў ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

Прэзідыум ВАК дазволіў выдаць дыпломы:

кандыдата фізіка-матэматычных навук — **Бяляўскаму** Станіславу Станіслававічу

кандыдата хімічных навук — **Захаравай** Кацярыне Пятроўне.

# І СЛОВАМ, І ПРЫКЛАДАМ

Важныя задачы камуністычнага выхавання студэнтаў у духу часу кладуцца на плечы вузаўскіх камсамольскіх арганізацый. Імена камсамол заклікан выхоўваць у студэнта якасці таварыскай патрабавальнасці да сябе і акружаючых, цвёрдай самадысцыпліны, непахіснага выканання вучэбнага распарадку. Іменна камсамол заклікан прывіць студэнтам з самага пачатку вучобы ў сценах вну пачуццё грамадскай адказнасці. І вось чаму важна, каб вузаўскія камсамольскія арганізацыі ясна бачылі перспектывы маральнага выхавання студэнтаў на працягу ўсяго працэсу навучання.

Маральнае выхаванне студэнтаў. Гэта значыць выхаванне ў духу камуністычнай маралі: дабівацца, каб у кожнага былі выпрацаваны, кожнаму прывіты і кожным студэнтам пастаянна, штодзень выконваліся маральныя прынцыпы, выкладзеныя ў Праграме КПСС—маральным кодэксе будаўніка камунізму.

**Адданасць справе камунізму, любоў да сацыялістычнай Радзімы, да краін сацыялізму.**

Выхаванне пачуцця любві да Радзімы і адданасці справе камунізму пачынаецца з першага ж дня знаёмства з факультэтам. Ужо традыцыйнымі сталі сходы першакурснікаў журфака, іх сустрэчы з прафесарска-выкладчыцкім саставам факультэта, з камсамольскім і прафсаюзным актывам перад пачаткам навучальнага года. Мэта іх—не проста знаёмства ўчарашніх абітурыентаў з усім тым, што ім прадстаіць вывучыць за пяць студэнцкіх год, з тымі, хто будзе на працягу гэтага часу шчодра дзяліцца з імі сваімі ведамі. Асноўная задача — пазнаёміць студэнтаў са слаўнымі традыцыямі універсітэта і факультэта, з іх гісторыяй, з патрабаваннямі, якія кожны студэнт, кожны камсамолец абавязан цвёрда падтрымліваць. Ужо на такой сустрэчы закладваюцца асновы пачуцця гонару за свой універсітэт, за свой факультэт, пачуцця адказнасці перад імі.

Вельмі цікава прайшла такая сустрэча 31 жніўня мінулага года. Выступаючых было шмат, і выказалі яны не толькі наказы, настаўленні і пажаданні, якім быць студэнту факультэта журналістыкі. Тут гаварылася аб тым, якім быць савецкаму чалавеку, савецкаму журналісту ўвогуле, каб апраўдаць прыналежнасць да «залатога фонду партыі».

**Быць адданым справе камунізму — значыць горача любіць сваю сацыялістычную Радзіму, правільна разумець палітыку Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.** У значнай меры садзейнічае гэтаму правядзенне бягучых і тэматычных палітінфармацый студэнтамі вучэбных груп з дапамогай куратараў. Плануецца гэтая работа так, каб кожны студэнт выступіў не менш двух разоў на працягу навучальнага года з паведамленнем аб важнейшых падзеях у краіне і за мяжой. Ад кожнага выступаючага патрабуецца ўменне ацаніць тое ці іншае паведамленне, прааналізаваць адабраныя матэрыялы, выказаць свой пункт гледжання. Таму палітінфармацыі на нашым факультэце праходзяць цікава. Ды і сама спецыфіка факультэта садзейнічае таму, што ўсе студэнты рэгулярна чытаюць газеты, слухаюць радыё. Інакш кажучы, выкарыстоўваюць сродкі масавай інфармацыі, каб быць у курсе ўсіх падзей.

Часта перад студэнцкай аўдыторыяй выступае старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі А. В. Балаш. Яго лекцыі аб міжнародным становішчы з цікавасцю слухаюць і студэнты, і выкладчыкі факультэта.

**Быць адданым справе камунізму — значыць глыбока вывучаць грамадскія дысцыпліны, тэарэтычную спадчыну класікаў марксізму-ленінізму, важнейшыя матэрыялы і дакументы КПСС і ўмела кіравацца імі ў практычнай дзейнасці, у паўсядзённым жыцці, звяраць па іх кожны свой крок, кожнай новай справай дабівацца іх ажыццяўлення.**

Яркім сведчаннем гэтага з'явіліся вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі. Так, на першым курсе з 84 студэнтаў, якія здавалі экзамен па гісторыі КПСС, 28 атрымалі «выдатна», 43 — «добра» і 13 — «здавальняюча».

**Горача любіць сваю сацыялістычную Радзіму — значыць глыбока ведаць яе гісторыю, ведаць, паважаць і любіць людзей, якія стваралі яе, шанаваць памяць загінуўшых за нашу светлую будучыню.**

Традыцыйнай стала на факультэце сустрэча студэнтаў першага курса з удзельнікам Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, удзельнікам грамадзянскай вайны М. М. Клімко, якая праводзіцца напярэдадні Кастрычніцкіх свят. М. М. Клімко— член КПСС з 1918 года, удзельнічаў у рэвалюцыйных баях у Маскве, бачыў і чуў У. І. Леніна. У яго ёсць аб чым расказаць цяперашняй моладзі. І трэба бачыць, з якой увагай слухаюць яго студэнты, з якім хваляваннем акружаюць яго пасля размовы. Кожнаму хочацца яшчэ штосьці пачуць аб дарагім Ільічу.

Вельмі цікава прайшла на факультэце ў кастрычніку сустрэча з вядомым пісьменнікам, былым чэкістам С. С. Смірновым, аўтарам кніг «Запіскі чэкіста», «Крэпасць без фартоў», «Брэсцкая крэпасць» і інш.

А расказы аб выкладчыках факультэта — удзельніках Вялікай Айчыннай вайны! Яны служаць справе маральнага выхавання. А выхаванне на жывых прыкладах найбольш эфектыўна. І натуральны вынік, калі многія студэнты лічаць узорам жыццё выкладчыкаў, бяруць з іх прыклад, імкнуцца быць падобнымі на іх.

Вось прыклад. Шмат разоў першакурснікам прыходзілася па самых розных пытаннях звяртацца да дэкана факультэта прафесара Р. В. Булацкага. Але што яны ведалі аб ім? І вось зусім нядаўна кафедрай тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання на факультэце быў арганізаван прагляд тэлевізійнага фільма «Палёт», які расказвае пра тое, як адважна ён біў ворага, пра смелыя палёты на самалёце, купленым за ўласныя зберажэнні.

Адбыліся на факультэце сустрэчы і з іншымі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны: лабарантам кафедры тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання Г. А. Жураўлёвым, намеснікам сакратара партбюро факультэта М. І. Сілуянавым, загадчыкам кафедры РТ М. Е. Дастанкам. Цікава расказаў студэнтам першага курса аб сваёй падпольна-разведвальнай дзейнасці ў гады вайны выкладчык кафедры РТ Г. З. Бягун.

— Прысутнічаеш на такой сустрэчы, і цябе ахоплівае пачуццё гонару за сваю краіну, за нашых людзей, выхаваных ёю. Хочацца хоць чымсьці быць падобнымі на іх, — так выказаў сваё ўражанне староста другой групы першага курса Генадзь Марозаў.

Штогод праводзяцца на факультэце і сустрэчы з журналістамі акруговай газеты «Во славу Родины». Да 55-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту СССР рэдкалегія насценнай газеты факультэта «Журналіст» падрыхтавала спецыяльны нумар, які расказвае аб выкладчыках — удзельніках Вялікай Айчыннай вайны.

**Горача любіць сацыялістычную Радзіму — значыць у любую хвіліну быць гатовым абараніць яе, кожным сваім поспехам мацаваць яе абаронную магутнасць.**

З поспехам выступаюць каманды факультэта па ваенна-прыкладных відах спорту. Так, напрыклад, каманда па зімоваму трохбор'ю — чэмпіён БДУ і ўладальнік пераходнага прыза Героя Савецкага Саюза У. С. Амельянюка. Журналісты на трэцім месцы ў першынстве БДУ па радыёспорту і стральбе, на пятым — па грэблі. Па шэрагу ваенна-прыкладных відаў нашы спартсмены занялі другое месца ў спаборніцтвах, якія праводзіліся ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР.

*(Працяг на 2-й стар.)*



*Бібліятэка юрыдычнага факультэта цяпер налічвае каля 127 700 кніг. Гэтым багаццем карыстаюцца больш як 2,5 тысячы студэнтаў дзённай, вячэрняй і завочнай форм навучання. Акрамя юрыстаў, грамадска - палітычную і мастацкую літаратуру тут атрымліваюць студэнты журфака. Усяго за год бібліятэка прымае каля 73 тысяч наведвальнікаў.*

*НА ЗДЫМКАХ: у бібліятэцы юрыдычнага факультэта.*

Фота *Д. Чаховіча.*



КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# НІЧОГА НЕ ЗДАРЫЛАСЯ...

Чарговая нарада сакратароў факультэцкіх камсамольскіх арганізацый сярод іншых пытанняў заслухала справаздачу аб рабоце пярвічнай арганізацыі першай групы трэцяга курса ФПМ.

Выступала групкамсорг Ларыса Шматкоўская. Гаварыла аб тым, як усё добра ў групе: узносы здаюць у тэрмін, даручэнні выконваюцца ахвотна і хутка, вучацца ўсе няблага (сярэдні бал мінулай сесіі 4,16), а нядаўні камсамольскі сход прайшоў актыўна, нават даклад зрабіла самастойна адна дзяўчына. Праўда, культурных мерапрыемстваў пакуль што не было. Але ўжо ўзяты білеты для сумеснага паходу ў тэатр. А нядаўна вырашылі сабраць бібліятэчку для якой-небудзь вясковай школы. Дык сабралі амаль за два дні.

Ларыса змоўкла на хвіліну, потым ціха дадала: вось і ўсё, здаецца.

Так, гаварыць ёй больш не было аб чым. І тады пасыпаліся пытанні: а як з улікам камсамольцаў, што яшчэ абмяркоўваецца на бюро, як рыхтаваліся да сходу «Кожнай групе, кожнаму камсамольцу — ударную справу»?

Ларыса хвалявалася.

— Як, адзін камсамолец не стаіць на ўліку? Ды я не ведала, што гэтым трэба цікавіцца і што гэта трэба правяраць. Пасяджэнні бюро? Апошняе было перад сходам. Ну, пагаварылі, як і што праводзіць. Не, у камітэце камсамола нічога не падказалі. сказалі толькі, што трэба правесці сход — і ўсё. Чаму не збіраліся па іншых пытаннях? А якія могуць быць яшчэ пытанні! У нас жа ўсё добра, і рабяты такія цудоўныя!

І наогул мяне ўпершыню абралі камсоргам і я амаль нічога не ведаю. Вучоба актыву? Мяне ніколі на яе не запрашалі.

Роспач і нават крыўда Ларысы былі шчырымі. Яна ж так любіць сваіх цудоўных хлопцаў і дзяўчат і так верыць у тое, што ў іх сапраўды ўсё добра. І стала шкада гэтую групу, у якой усё камсамольскае жыццё выражаецца ва ўзносах і рэдкіх сходах.

Вы чулі такі выраз: варыцца ў сваім саку? Іменна ў такім стане знаходзіцца першая група. Сабраліся ў ёй пасля спецыялізацыі розныя людзі, хутка наладзілі нядрэнныя адносіны паміж сабой і надоўга заспакоіліся. А ў камітэце камсамола ФПМ таксама жывуць спакойна. Ім і справы няма да нейкай там адной групы, дзе пакуль усё «ціха».

Вучоба актыву. Многія лічаць яе фармальнасцю: толькі час адбірае. Але каб прайшла яна на ФПМ як добрая, шчырая размова паміж камсамольскімі важакамі, можа б не чырванела сёння Ларыса.

Наша бяда ў тым, што за грандыёзнасцю і маштабнасцю праводзімых мерапрыемстваў мы забываем нярэдка аб самым галоўным — камсамольскай групе, ад ініцыятывы і баявітасці якой залежыць жыццядзейнасць камсамольскай арганізацыі.

Сённяшняя нарада паказала, што такія сустрэчы з камсамольскімі бюро груп даюць многа абодвум бакам. А калі б іх наладзілі факультэцкія камітэты камсамола!

Здараецца, што, не атрымаўшы дапамогі «зверху», «унізе» сядзяць і здзіўляюцца, што так сумна ім жывецца: мы вось такія цудоўныя, а пра нас забыліся. І згодны чакаць хоць да канца вучобы, замест таго каб самім прыйсці ў камітэт камсамола.

У першай групе трэцяга курса ФПМ лічаць, мабыць, што іх пакрыўдзілі. «І за што толькі? У нас жа нічога не здарылася...».

Л. ПЕРАСЫПКІНА.

ДАЛУЧЭННЕ ДА НАВУКІ

# АД ПЕРШАГА ДА ПЯТАГА

Глыбокая зацікаўленасць вучоных з розных галін ведаў да біялагічных аб'ектаў даследавання, інтэнсіўныя пошукі новых падыходаў да вывучэння тайны жывога, шэраг знамянальных адкрыццяў у біялогіі ўжо сёння не выклікаюць сумненняў у актуальнасці праблемы. Біёлагі выходзяць на пярэдні край навукі. Таму не дзіўна, што ўчарашнія школьнікі, а сёння студэнты біялагічнага факультэта ўжо з першага курса імкнуцца ўключыцца ў навукова-даследчую работу.

Савет СНТ факультэта сумесна з камітэтам камсамола ўдзяляе вялікую ўвагу рабоце з першакурснікамі. Вопыт паказвае, што чым раней студэнт уключаецца ў самастойную даследчую работу, тым больш плённыя яе вынікі. Штогод у пачатку вучэбнага семестра ў спецыяльным выпуску «Бюлетэня СНТ» падрабязна расказваецца аб кожнай кафедры, яе гісторыі і важнейшых напрамках навуковых даследаванняў. Акрамя таго, праводзяцца групавыя сходы з удзелам членаў савета СНТ і лепшых гуртакоўцаў, на якіх можна больш падрабязна даведацца аб кожнай кафедры, атрымаць адказ на любое пытанне, параіцца аб выбары прафесіі. І, нарэшце, першакурснікі знаёмяцца з абсталяваннем лабараторый і разам са сваімі старэйшымі таварышамі праводзяць нескладаныя эксперыменты. Усё гэта дапамагае ім у кароткі тэрмін атрымаць больш поўнае ўяўленне аб факультэце, стане навукова-даследчай работы і выбраць спецыялізацыю па душы.

Формы навуковай работы студэнтаў на біяфаку разнастайныя. На малодшых курсах студэнтам яшчэ цяжка вырашаць самастойна пытанні, звязаныя з пастаноўкай эксперыментаў, таму яны пачынаюць з работы ў прадметных гуртках. На факультэце працуе восем кафедральных гурткоў і гурток па праблемах тэарэтычнай і малекулярнай біялогіі. На іх пасяджэннях можна пачуць выступленні буйных вучоных – біёлагаў нашай рэспублікі, гасцей з іншых рэспублік, вядучых прафесараў і дацэнтаў біяфака. Аднак асноўную работу вядуць самі студэнты. Яны рэгулярна дакладваюць аб выніках асабістых навуковых даследаванняў, робяць паведамленні аб навейшых дасягненнях у біялогіі, шырэй знаёмяцца з тымі яе раздзеламі, якія няпоўна ахоплены праграмай вучэбнага працэсу.

Тут шырокае поле дзейнасці для пачынаючых. Яны накопліваюць веды, вучацца працаваць над літаратурай, абагульняць і рабіць самастойныя вывады.

Многія студэнты малодшых курсаў не абмяжоўваюцца ўдзелам у рабоце прадметных гурткоў, а імкнуцца практычна прымяніць свае веды ў лабараторыях. Ім заўсёды ідуць насустрач. Спачатку яны замацоўваюцца да старшакурснікаў, а пасля авалодання метадамі пастаноўкі навуковых эксперыментаў атрымліваюць самастойныя заданні. Гэта дазваляе ім ужо да III—IV курса па выніках асабістых даследаванняў рабіць паведамленні на студэнцкіх навуковых канферэнцыях БДУ, а таксама ў іншых ВНУ краіны, удзельнічаць у аглядзе-конкурсе на лепшую студэнцкую навуковую работу. Лепшыя работы публікуюцца ў навуковых журналах і зборніках. К канцу вучобы ва універсітэце такія студэнты, як правіла, падыходзяць ужо з якасцямі навуковых работнікаў, здольны вырашаць самастойна даволі складаныя задачы.

Цікава прывесці вынікі конкурсаў студэнцкіх работ. Так, на рэспубліканскі агляд-конкурс 1971 года біялагічны факультэт прадставіў 56 работ. Да І катэгорыі былі аднесены 39 з іх і 17 работам прысуджана ІІ катэгорыя. Адхіленых работ і работ ІІІ катэгорыі не было. У 1972 годзе на рэспубліканскі агляд-конкурс прадстаўлена 78 работ. З іх да І катэгорыі аднесены 57 а астатнія 21 аднесены да ІІ катэгорыі. Акрамя таго, пяць работ аднесены да катэгорыі лепшых па секцыі біялагічных і сельскагаспадарчых навук, іх аўтары ўзнагароджаны грашовымі прэміямі. Гэта работы О. Давыдзенкі (І прэмія); Т. Фаменкі, Т. Галаніцкай і Н. Брускова (ІІ прэмія); Н. Назаравай (ІІІ прэмія).

Па выніках Усесаюзнага конкурсу 1972 года адна работа ўдастоена медаля (К. Бяляўскі і Н. Грыц) і адна адзначана граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР (Н. Підбуртная). Работа студэнткі З. Жук адзначана граматай на Усесаюзным конкурсе па грамадскіх навуках.

За 1972 год студэнтамі біяфака апублікавана і падпісана да друку каля 40 навуковых работ.

Па выніках агляду-конкурсу на лепшы факультэт па пастаноўцы навукова-даследчай работы студэнтаў біялагічны факультэт выйшаў на першае месца ва універсітэце. Цяпер наперадзе XXX юбілейная студэнцкая навуковая канферэнцыя. Па традыцыі на гэтай канферэнцыі асноўная ўвага ўдзяляецца работам студэнтаў малодшых курсаў, якія на пасяджэннях секцый дакладваюць асноўныя вынікі сваіх работ. Студэнты ж V курса рыхтуюцца да ўдзелу ў канферэнцыях у іншых ВНУ краіны. Упершыню ў гэтым годзе студэнты біяфака прадставяць на канферэнцыю не толькі вынікі асабістых эксперыментальных даследаванняў, але і распрацоўкі некаторых філасофскіх праблем біялогіі на спецыяльнай секцыі.

**А. БЫЛІНСКІ,**
**кіраўнік СНТ факультэта, кандыдат біялагічных навук.**



Вялікі практыкум па заалогіі ў студэнтаў IV курса біяфака. Фота Д. Чаховіча.

# І СЛОВАМ, І ПРЫКЛАДАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

Актыўна ўключыліся студэнты факультэта ў работу па новаму комплексу ГПА. Упершыню з восені мінулага года стала праводзіцца факультэцкая спартакіяда, што дазваляе прыцягнуць да заняткаў спортам, да ўдзелу ў спаборніцтвах большую колькасць студэнтаў. На факультэце дзейнічаюць валейбольная, баскетбольная, стралковая секцыі і секцыя настольнага тэнісу. Сто восемдзесят тры студэнты (амаль кожны другі) маюць спартыўныя разрады. Два з іх — кандыдаты ў майстры спорту СССР і адзін — майстар спорту міжнароднага класа.

Шырока прапагандуюцца дасягненні нашых спартыўных каманд. Так, спортбюро аформіла спецыяльны стэнд, які адлюстроўвае спартыўнае жыццё факультэта, стэнд «ГПА на старце». Перыядычна выпускаюцца фотагазеты і фотабюлетэні.

Сустрэўшы цяжкасці пры удасканаленні новага комплексу ГПА, спортбюро факультэта звярнулася ў партыйную арганізацыю. У лістападзе адбылося сумеснае пасяджэнне партыйнага бюро, камітэта камсамола, прафбюро і спортбюро факультэта з павесткай дня «Спартыўнае жыццё на факультэце», дзе было прынята рашэнне аб здачы норм ГПА па кожнай акадэмічнай групе.

Вялікай падзеяй на факультэце з'явілася ўручэнне залатых значкоў «Гатоў да працы і абароны». Першымі іх уладальнікамі сталі член камітэта камсамола Уладзімір Купрыенка, камсорг першай групы другога курса Галіна Канашэвіч і кандыдат у майстры спорту па лыжах студэнт другога курса Сяргей Суханаў.

**Любіць сваю сацыялістычную Радзіму — значыць паважаць яе законы, глыбока вывучаць іх, падтрымліваць самім і патрабаваць іх падтрымання акружаючымі.**

Таму прававое выхаванне ставіць іменна гэтыя задачы, прывівае іменна гэтыя пачуцці.

Вучэбным планам на факультэце прадугледжан спецыяльны прадмет «Асновы савецкага права». Пасля саракагадзіннага лекцыйнага курса студэнты здаюць залік па гэтаму прадмету.

Вялікую работу па прававому выхаванню студэнтаў праводзяць куратары вучэбных груп.

У лістападзе Кастрычніцкі РАУС г. Мінска давёў да ведама дэканата, што на студэнтку трэцяга курса Н. Лебедзеву накладзен штраф за парушэнне правіл вулічнага руху. Гэтаму паведамленню адразу ж удзялілі належную ўвагу. На праведзенай нарадзе куратараў было вырашана азнаёміць усіх студэнтаў факультэта з новымі правіламі вулічнага руху. І ў снежні на ўсіх курсах у пазалекцыйны час былі праведзены гутаркі, на якія былі запрошаны супрацоўнікі міліцыі. Адпаведна распараджэнню рэктарата усе студэнты здалі залік па новых правілах вулічнага руху.

З цікавасцю слухалі нядаўна студэнты члена Вярхоўнага суда БССР А. А. Нічыпаровіча, які выступіў з лекцыяй «Права і мараль». Падобныя сустрэчы запланавана праводзіць часцей.

**Быць адданым справе камунізму — значыць быць верным справе інтэрнацыянальнай садружнасці, значыць кожнай справай мацаваць дружбу краін сацыялістычнага лагера.**

Вельмі цікава праходзілі восенню мінулага года гутаркі аб брацкіх сацыялістычных краінах у студэнтаў трэцяга курса. І не дзіўна, таму што двое трэцякурснікаў працавалі ў складзе інтэрнацыянальнага студэнцкага будаўнічага атрада імя Л. Карастаянавай у Народнай Рэспубліцы Балгарыі. З захапленнем расказваў стараста курса, камісар атрада Мікалай Аксяневіч аб прыгажосці балгарскіх гарадоў, аб шчырасці людзей, аб іх любві да савецкага народа. Баец атрада Уладзімір Купрыенка ў некалькіх нумарах насценнай газеты «Журналіст» змясціў свае ўспаміны.

Ударную працу нашых студэнтаў на будаўніцтве дарогі ў гарах ацанілі па заслугах: ім было прысвоена званне ўдарніка студэнцкага будаўнічага руху Балгарыі.

Шмат уражанняў аб Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы прывезлі студэнты Уладзімір Далькоў і Вячаслаў Булацкі. Яны з гонарам выканалі абавязкі байца інтэрнацыянальнага будаўнічага атрада, апраўдалі давер'е камсамольскай арганізацыі факультэта.

Выступілі перад курсам і Віктар Кубека, намеснік сакратара камсамольскага бюро курса, і Сяргей Ціванаў, арганізатар стралковай секцыі на факультэце. Яны таксама правазілі свой працоўны семестр у інтэрнацыянальным атрадзе «Дружба». Мікалай Асінскі, Мікалай Станкевіч, брыгадзіры інтэрнацыянальнага студэнцкага будаўнічага атрада, Валодзя Барысенка, майстар таго ж атрада, поплеч са студэнтамі Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага працавалі на будаўніцтве другой чаргі Беларускага аўтамабільнага завода БелАЗ.

Шмат пісем прыходзіць на факультэт з Балгарыі, ГДР. І не дзіўна: там засталіся сябры. У кожным пісьме — словы дружбы, любві да савецкага народа. Вось што піша, напрыклад, Васіл Канджараў, студэнт Сафійскага універсітэта, былы камандзір балгарскай групы інтэрнацыянальнага студэнцкага будаўнічага атрада «Дружба», які працаваў летам у горадзе Жодзіна:

«...Гэта былі самыя шчаслівыя дні ў маім жыцці. Гавораць, што ў гасцях добра, а дома — лепш. Не ведаю. Але мне чамусьці хочацца зноў прыехаць у вашу цудоўную краіну».

**А. РАКОВІЧ,**
**намеснік дэкана,**
**М. НІКІШЫН,**
**сакратар камітэта камсамола.**

# ЧВЭРЦЬ ВЕКА САВЕЦКА-БАЛГАРСКАЙ ДРУЖБЫ

*25 год таму назад, 18 сакавіка 1948 года, быў падпісан Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і Народнай Рэспублікай Балгарыяй. Гэты дагавор, заснаваны на глыбокіх гістарычных традыцыях, на прынцыпах пралетарскага інтэрнацыяналізму, поўнага раўнапраўя, бескарыснай узаемнай дапамогі і падтрымкі, адлюстраваў карэнныя інтарэсы нашых народаў, садзейнічаў умацаванню справы сацыялізму ва ўсім свеце.*

Ацэньваючы значэнне дружбы з Савецкім Саюзам для балгарскага народа, Георгій Дзімітроў гаварыў: «Няма і не можа быць разважнага балгарына, што любіць сваю радзіму, які б не быў перакананы, што шчырая дружба з Савецкім Саюзам з'яўляецца не менш неабходнай для нацыянальнай незалежнасці і росквіту Балгарыі, чым сонца і паветра для ўсякай жывой істоты».

Гады, прайшоўшыя з часу падпісання гэтага гістарычнага дакумента, пераканаўча прадэманстравалі, што адносіны паміж СССР і НРБ — адносіны сапраўднай дружбы, адзінства і братэрства, поўнага ўзаемаразумення і ўсебаковага плённага супрацоўніцтва — з'яўляюцца прыкладам новага тыпу адносін, прыкладам сацыялістычнага інтэрнацыяналізму ў дзеянні.

Пацверджаныя жыццём прынцыпы брацкай дружбы атрымалі далейшае развіццё ў новым Дагаворы аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і НРБ, заключаным 12 мая 1967 года.

Разам з усімі народамі Савецкага Саюза важны ўклад у развіццё савецка-балгарскай дружбы ўносіць беларускі народ. З кожным годам мацнее і шырыцца грамадска-палітычнае, эканамічнае і культурнае супрацоўніцтва Беларускай ССР і Народнай Рэспублікі Балгарыі.

Звыш 80 беларускіх прадпрыемстваў выконваюць заказы НРБ. Наменклатура тавараў даволі разнастайная — аўтамашыны і трактары, металарэжучыя станкі і электронна-вылічальныя машыны, скрэперы і бульдозеры, кінаўстаноўкі і фотаапараты, гадзіннікі і іншыя тавары.

Абсталяванне з маркай беларускіх прадпрыемстваў устаноўлена на буйнейшых новабудоўлях Балгарыі — на Крэмікаўскім металургічным камбінаце, нафтахімічным камбінаце ў Бургасе, ТЭЦ «Марыца-Усход», на Карлаўскім трактарным заводзе, на электратэльферным заводзе ў Дзімітраўградзе і іншых.

З канвеераў Мінскага і Беларускага аўтазаводаў адпраўлена ў НРБ звыш 3500 аўтамашын. На палях Балгарыі працуюць больш 15 тысяч трактараў «Беларусь». Высокую ацэнку далі балгарскія спецыялісты ЭВМ «Мінск». У адным з адкрытых пісем балгарскага літаратара Г. Вылчава гаварылася: «ЭВМ «Мінск-32» сёння ў нашай Сафіі дастойна прадстаўляе і Мінск, і ўсю індустрыяльную Беларусь. Яна прыйшла да нас служыць верай і праўдай і найлепшым чынам праслаўляе сваіх стваральнікаў, таленавітых беларускіх вучоных і інжынераў».

У сваю чаргу з кожным годам усё больш абсталявання, машын і іншых тавараў паступае ў БССР з Балгарыі. Высокую ацэнку атрымала прадукцыя вядомага балгарскага аб'яднання «Балканкар» — пагрузачныя машыны, электракары, электратэльферы. У значнай колькасці завозяцца балгарскія электраматоры, аўтамабільныя акумулятары, вылічальныя машыны, тавары шырокага ўжытку, гародніна, садавіна і г. д.

Беларуская ССР прымае актыўны ўдзел у савецка-балгарскім навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Мінскаму трактарнаму заводу належыць значная роля ў стварэнні балгарскага трактарабудавання. Сёння дзякуючы дапамозе калектыву МТЗ Карлаўскі трактарны завод паспяхова асвоіў выпуск трактараў «Беларусь», «МТЗ-50» і «Т-54В».

У адпаведнасці з рэкамендацыямі комплекснай праграмы сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі краін — членаў СЭУ сумеснымі намаганнямі беларускіх і балгарскіх спецыялістаў была створана новая электронна-вылічальная машына «трэцяга пакалення» «ЭС-1020».

Калектывы многіх прадпрыемстваў падтрымліваюць вытворчыя кантакты з калектывамі блізкіх па профілю балгарскіх прадпрыемстваў. Выключна карысны абмен вопытам праводзіцца паміж працаўнікамі сельскай гаспадаркі.

Паспяхова развіваюцца шырокія сувязі брацкіх сацыялістычных культур, ахопліваючы самыя розныя бакі духоўнага жыцця беларускага і балгарскага народаў.

Плённая творчая дружба устанавілася паміж навукова-даследчымі інстытутамі АН БССР і Балгарскай акадэміі навук. Здзяйсняецца абмен вучонымі, распрацоўка сумесных навукова-даследчых работ, удзел у навуковых канферэнцыях, сімпозіумах і г. д.

Ужо шмат год цесныя кантакты існуюць паміж беларускімі і балгарскімі літаратарамі. Аб зацікаўленасці нашых чытачоў да балгарскай літаратуры сведчыць наступны факт: к канцу 1972 года ў перакладзе на беларускую мову выйшла 23 кнігі балгарскіх аўтараў агульным тыражом больш 200 тысяч экземпляраў. У сваю чаргу ў Балгарыі выдадзена каля 30 кніг празаікаў і паэтаў Беларусі.

За плённую перакладчыцкую дзейнасць беларускі паэт, дацэнт БДУ Н. С. Гілевіч быў узнагароджан балгарскім ордэнам Кірылы і Мяфодзія першай ступені.

Шырокі і рознабаковы характар носіць абмен у галіне мастацтва. Ужо сталі традыцыяй узаемныя гастролі творчых калектываў і асобных выканаўцаў, правядзенне дзён музыкі, кінафестываляў, выставак.

Вялікая роля ва ўмацаванні ўсебаковых сяброўскіх сувязей паміж брацкімі народамі належыць беларускаму аддзяленню Таварыства савецка-балгарскай дружбы, заснаванаму ў 1961 годзе (старшыня—міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прафесар М. М. Мяшкоў). У рэспубліцы створаны адно абласное і 22 мясцовыя аддзяленні, якія абапіраюцца на шырокае кола актывістаў. Паспяхова развіваюцца сяброўскія сувязі пабрацімаў—працоўных Магілёўскай вобласці і Габраўскай акругі НРБ.

Выдатным укладам у справу ўмацавання непарушнага адзінства савецкага і балгарскага народаў стаў сяброўскі візіт у Савецкі Саюз партыйна-ўрадавай дэлегацыі Народнай Рэспублікі Балгарыі на чале з першым сакратаром ЦК БКП, Старшынёй Дзяржаўнага Савета НРБ таварышам Тодарам Жыўкавым. Перагаворы ў Маскве пацвердзілі поўнае адзінства поглядаў КПСС і БКП, урадаў СССР і НРБ па ўсіх пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва і далейшага ўмацавання згуртаванасці сацыялістычнай садружнасці. «Вернасць прынцыпам сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, — гаварыў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў у прамове на прыёме ў гонар балгарскай дэлегацыі 13 лістапада 1972 года, — дазваляе нам арганічна спалучаць нацыянальныя і інтэрнацыянальныя інтарэсы нашых краін. У нас адна агульная мэта. Мы навечна звязалі свой лёс са справай Леніна, са справай сацыялізму. Дружба Савецкага Саюза і сацыялістычнай Балгарыі крыштальна чыстая, і нішто не можа яе азмрочыць.

**Д. МЕЛЬЦАР,**
**намеснік старшыні аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы БДУ, дацэнт.**

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

**Напярэдадні 25-годдзя падпісання савецка-балгарскага Дагавору ў адрас Сафійскага універсітэта пайшло пісьмо за подпісам рэктара БДУ У. М. Сікорскага, сакратара парткома Т. Я. Дударавай, старшыні мясцкома В. Ф. Чыгіра і сакратара камітэта камсамола А. Г. Слукі, у якім гаворыцца:**

**«Калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна сардэчна віншуе прафесараў і выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў з выпадку 25-й гадавіны падпісання савецка-балгарскага Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе. Адносіны паміж савецкім і балгарскім народамі з'яўляюцца адносінамі дружбы, адзінства і брацтва, прыкладам сацыялістычнага інтэрнацыяналізму ў дзеянні.**

**Мы рады, што з кожным годам расшыраюцца навуковыя і сяброўскія сувязі паміж калектывамі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў. Выказваем упэўненасць, што наша супрацоўніцтва будзе і далей паспяхова развівацца.**

**Няхай мацнее і працвітае вечная і непарушная дружба савецкага і балгарскага народаў!»**

# СЯБРОЎСТВА УНІВЕРСІТЭТАЎ

**Вялікая дружба звязвае наш універсітэт з Сафійскім універсітэтам імя Клімента Ахрыдскага. У снежні 1966 года быў падпісан дагавор аб узаемным супрацоўніцтве, які прадугледжваў удасканаленне вучэбнага працэсу, павышэнне узроўню навуковай і выхаваўчай работы ва універсітэтах, узаемны абмен прафесарамі і выкладчыкамі, аспірантамі і студэнтамі, абмен вучэбна-метадычнай і навуковай літаратурай, вучэбнымі праграмамі і г. д.**

З лекцыямі перад прафесарска-выкладчыцкім саставам і студэнтамі Сафійскага універсітэта выступалі прафесары А. Н. Сеўчанка, С. А. Умрэйка, М. Р. Круцько, В. Р. Заўрыеў, Ф. Д. Гахаў, У. П. Платонаў, М. Т. Раманоўскі, І. Я. Навуменка, дацэнты М. П. Халімановіч, П. З. Савачкін, А. А. Галаўко, Д. Б. Мельцар і іншыя. Прафесар Л. В. Валадзько прыняў удзел у навуковай канферэнцыі, прысвечанай 25-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі Балгарыі, прафесар М. Г. Булахаў і дацэнт П. П. Шуба—у рабоце сімпозіума па рускай мове.

У сваю чаргу вялікі інтарэс у нашых студэнтаў і выкладчыкаў выклікалі лекцыі прафесараў Сафійскага універсітэта Х. Іванава, А. Мілчава, С. Русакіева і іншых.

З мэтай вывучэння вопыту пастаноўкі вучэбна-метадычнай і выхаваўчай работы БДУ наведалі акадэмік Д. Косеў, які з'яўляўся рэктарам Сафійскага універсітэта, прарэктары Д. Сімаў і Э. Георгіеў.

У Сафійскім універсітэце прайшлі 10-месячную стажыроўку аспіранты Б. Ю. Норман і У. А. Карпаў. Б. Ю. Норман паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю па балгарскай мове, а У. А. Карпаў у бліжэйшы час будзе абараняць. Стажыроўку паспяхова завяршыў і дацэнт кафедры палітэканоміі Е. Б. Асіпкоў.

У сваю чаргу балгарскі аспірант Йардан Дзімітроў у нас ва універсітэце абараніў дысертацыю на ступень кандыдата фізіка-матэматычных навук (навуковы кіраўнік прафесар Р. Ф. Габасаў). Румяна Яўцімова на працягу трох год праходзіла стажыроўку на філфаку, паспяхова працуючы над кандыдацкай дысертацыяй.

У цяперашні час на факультэце прыкладной матэматыкі займаюцца 30 балгарскіх студэнтаў, якія авалодваюць спецыяльнасцю, так неабходнай для народнай гаспадаркі Балгарыі. З 1967 года здзяйсняецца абмен студэнцкімі групамі для правядзення вытворчай практыкі.

Варта адзначыць, што балгарская праблематыка з'яўляецца прадметам навуковых даследаванняў многіх выкладчыкаў універсітэта. Толькі за апошнія гады абаранілі кандыдацкія дысертацыі М. П. Квочкін («Збліжэнне горада і вёскі ва ўмовах сацыялістычнай садружнасці — на вопыце Народнай Рэспублікі Балгарыі») і У. І. Ганчароў («Раманы Стаяна Загарчынава і некаторыя праблемы развіцця балгарскай гістарычнай прозы»).

Многія работы нашых вучоных былі выдадзены ў Балгарыі. Зроблены пэўныя крокі да падрыхтоўкі сумесных навуковых даследаванняў.

Наладжан кнігаабмен бібліятэкамі двух універсітэтаў. Паспяхова здзяйсняюцца кантакты паміж партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі. З вопытам работы партыйнай арганізацыі нашага універсітэта азнаёмілася сакратар парткома Сафійскага універсітэта Весяліна Брэскоўска, а Сафійскага — сакратар парткома БДУ Т. Я. Дударава.

Паміж камітэтам камсамола БДУ і камітэтам Дзімітроўскага Камуністычнага Саюза Моладзі Сафійскага універсітэта быў заключан дагавор аб дружбе. У адпаведнасці з ім група камсамольскіх актывістаў нашага універсітэта прыняла ўдзел у студэнцкім сімпозіуме «Роля і значэнне прыватных і грамадскіх навук у працэсе фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду ў студэнтаў», які адбыўся ў Сафіі.

У снежні 1971 года ў Сафійскі універсітэт выязджаў народны ансамбль танца БДУ «Крыжачок» у саставе 40 студэнтаў, а восенню 1972 года танцавальны калектыў сафійскіх студэнтаў нанёс адказны візіт.

У мінулым годзе група балгарскіх студэнтаў у саставе інтэрнацыянальнага будаўнічага атрада «Дружба» ўдзельнічала ў будаўніцтве новага аб'екта на аўтамабільным заводзе ў Жодзіна, а нашы студэнты — на будаўніцтве аўтастрады ў Балгарыі.

У развіццё сяброўскіх сувязей паміж Беларускім і і Сафійскім універсітэтамі значны ўклад уносіць аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы, створанае ў 1969 годзе.

Ва універсітэце адкрыта аўдыторыя савецка-балгарскай дружбы, у якой праводзяцца выстаўкі, што расказваюць аб поспехах балгарскага народа ў будаўніцтве сацыялізму, аб сяброўскіх сувязях беларускага і балгарскага народаў, аб супрацоўніцтве нашых універсітэтаў.

Вялікі інтарэс у выкладчыкаў і студэнтаў выклікае кіналекторый «Наш сябра—сацыялістычная Балгарыя». У свята савецка-балгарскай дружбы выліўся вечар балгарскай літаратуры, у якім прынялі ўдзел заслужаны дзеяч культуры, лаўрэат Дзімітроўскай прэміі пісьменнік Д. Ангелаў, паэты І. Давыдкаў, А. Германаў, Н. Вылчаў.

Напярэдадні юбілею—25-годдзя Дагавора аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і НРБ —калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна жадае прафесарам, выкладчыкам, студэнтам і супрацоўнікам Сафійскага універсітэта, як і ўсяму балгарскаму народу, новых поспехаў у сацыялістычным будаўніцтве.

**М. БАРЫСАЎ.**



*Тунелі праз Стара Планіну. Усяго іх налічваецца тут каля 20-ці.*



*У горадзе Бургасе.*

# З КЛОПАТАМ АБ СТУДЭНЦЕ

Студэнт ёсць студэнт. Яму заўсёды хочацца як мага лепш правесці свой вольны час: паслухаць музыку, пабываць у музеі, пазнаёміцца з нечым новым, цікавым, карысным. Усё гэта ў многім залежыць ад таго, якія сродкі выдзяляюцца на тое ці іншае мерапрыемства. І таму не дзіўна, што першым пытаннем на чарговым прэзідыуме прафкома было зацвярджэнне сметы прафкома на 1973 год.

Дакладчык старшыня прафкома М. Дрозд расказаў аб размеркаванні грашовых сродкаў. Толькі на матэрыяльную дапамогу студэнтам выдзелена каля 8 тысяч рублёў, вялікая сума грошай прызначаецца на арганізацыю культурных мерапрыемстваў, на спартыўна-аздараўленчую работу, а таксама на пуцёўкі ў дамы адпачынку, санаторыі і прафілакторый. Лічбы, якія прывёў М. Дрозд, яскрава сведчаць аб клопатах партыі і ўрада аб студэнтах.

Нядаўна прадстаўнікі прафкома праверылі ўплату членскіх узносаў у некаторых групах факультэта прыкладной матэматыкі, юрыдычнага, геаграфічнага і іншых. Большасць студэнтаў тэрмінова ўплачвае прафсаюзныя ўзносы, але некаторыя студэнты фізічнага, хімічнага, геаграфічнага факультэтаў часам «забываюць» своечасова зрабіць гэта. На некаторых факультэтах прафгрупоргі нядобрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў. У чым гэта праяўляецца? Студэнт павінен уплачваць за месяц 20 капеек. Але некаторыя прафоргі, каб скрыць тых, хто не плаціць ўзносы, замест марак на 20 капеек наклейваюць маркі на пяць капеек. Аб усім гэтым і гаварыў намеснік старшыні прафкома А. Жылінскі.

Амаль паўгода пры прафкоме дзейнічае карэспандэнцкі пункт. За кожным факультэтам замацаваны студэнты факультэта журналістыкі. Яны на старонках насценных газет і шматтыражкі расказваюць аб жыцці прафсаюзных арганізацый. Аб дзейнасці карпункта, або яго бліжэйшых задачах таксама вялася гутарка на прэзідыуме. Вырашана з кожнага факультэта ўвесці па аднаму студэнту ў карэспандэнцкі пункт, аб'явіць агляд - конкурс насценгазет факультэтаў па асвятленню прафсаюзнага жыцця. Выбрана журы. Пераможцы будуць узнагароджаны грашовымі прэміямі і граматамі прафкома. Вырашана таксама аб'явіць конкурс на лепшы артыкул, карэспандэнцыю, замалёўку аб прафсаюзным жыцці ў шматтыражцы.

Апошнім было пытанне аб адпачынку студэнтаў. Некаторыя з іх, атрымаўшы пуцёўкі ў дамы адпачынку ці санаторыі, не выязджаюць у здраўніцы. Члены прэзідыума прафкома заслухалі студэнтак IV курса філалагічнага факультэта Алу Федзюковіч і Валю Гурбановіч. Гэтыя студэнткі атрымалі пуцёўкі, але не выехалі ў дом адпачынку. За гэта ім аб'яўлена вымова і спагнан поўнасцю кошт пуцёвак.

Усе пытанні, якія былі абмеркаваны на чарговым прэзідыуме прафкома, прасякнуты клопатамі аб студэнце, яго паспяховай вучобе і адпачынку.

І. СЦЯПУРА.
(Карэспандэнцкі пункт прафкома).

# РУСКІ ЧАЙ

*У актавай зале інтэрната № 7 у мінулую суботу было надзвычай шумна і весела. Тут сабраліся звыш 50 замежных студэнтаў-першакурснікаў з розных факультэтаў.*

*«Чай піць — не дровы секчы», — урачыста вымаўляе кубінец каля дзвярэй адну з рускіх прымавак, якая служыць яму пропускам на загадкавы вечар пад назвай «Рускі чай».*

*Выкладчыкі кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта Г. А. Берзінь і Г. К. Бадрова, нібы кантралёры, стаяць каля ўваходу і пасля кожнай цікавай прыказкі радасна ўсміхаюцца, запрашаючы студэнтаў да стала.*

*Паўнапраўная гаспадыня вечара Аляксандра Віктараўна Куцэнка разлівае ў шклянкі чай і расказвае, калі па рускаму звычаю п'юць чай упрысыпку, а калі ўпрыкуску. Расказ Аляксандры Віктараўны дапаўняе «лекцыя аб чаяванні» аднаго з балгарскіх студэнтаў.*

*А калі на сцэну выходзяць кубінцы, у зале не заціхае смех.*

*Кожны ўдзельнік, кожная група ўпотай ад другой рыхтавалі для вечара па некалькі нумароў мастацкай самадзейнасці.*

*І вось кубінцы, прадстаўнікі аднаго з самых вясёлых народаў свету, заваёўваюць увагу ўсіх прысутных і прымушаюць журы ўзяць сабе на ўлік здольнасць кубінскай групы.*

*Гэта не рэпартаж з месца спаборніцтваў, хоць так і хочацца расказаць аб тым, як адзін лепш за другі выступалі потым балгарскія, в'етнамскія студэнты.*

*Не адзін з прысутных здзіўляўся ў той вечар вынаходніцтву і запалу сваёй выкладчыцы Аляксандры Віктараўны.*

*«Рускі чай» у асноўным быў арганізаван выкладчыкамі кафедры рускай мовы і прадстаўнікамі дэканата па навучанню замежных студэнтаў. Таму найбольшае адлюстраванне на вечары знаходзілі пытанні рускай мовы. Віктарыны, загадкі дапамаглі выкладчыкам высветліць, наколькі добра замацаваны веды студэнтаў па граматыцы, лексіцы рускай мовы, наколькі добра або дрэнна ведаюць студэнты з розных краін свету наш фальклор, нашы песні.*

*Пяцігадовая Наташа Мяцельская іграла, напрыклад, на піяніна мелодыі рускіх песень. І хто з замежных студэнтаў першым успомніць назву песні, той будзе пераможцам. Яму прадастаўлялася права цягнуць бяспройгрышны латарэйны білет.*

*Шмат было смеху, калі ў час розыгрышу латарэі балгарыну дасталася пудра, адной з в'етнамскіх дзяўчат — попельніца, а самаму вясёламу ўдзельніку вечара — кубінцу Фабрыцыа — выпаў залік-аўтамат па рускай мове ў канцы гэтага семестра.*

*У якасці ацэнкі гэтаму вечару могуць служыць словы старшыні савета дружбы Саміра Шахіна:*

*— Які ўжо год вучуся ва універсітэце, а нават не здагадваўся, што «рускі чай» можа быць такім салодкім і прыемным.*

*В. РАДКЕВІЧ,
студэнтка.*

# ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ



З мэтай лепшага абслугоўвання чытачоў і больш поўнага задавальнення іх патрэб бібліятэка універсітэта перайшла на дыферэнцыраваны метад абслугоўвання. На даным этапе ён заключаецца ў наступным: арганізаван абанемент вучэбнай літаратуры і абанемент навуковай і мастацкай літаратуры, створаны дзве галіновыя студэнцкія чытальныя залы, чытальная зала № 3 (гуманітарних і грамадскіх навук) і чытальная зала № 4 (прыродазнаўчых і тэхнічных навук).

Галіновымі чытальнымі заламі (III паверх) могуць карыстацца студэнты усіх факультэтаў і ўсіх форм навучання. Улічваючы тое, што кніжны фонд размешчан непасрэдна ў залах, побач з рабочымі месцамі чытачоў, апошнім неабходна прытрымлівацца вызначаных правіл: заходзіць у чытальную залу без паліто, партфеляў і сваіх кніг, а літаратурай, узятай тут, карыстацца толькі ў гэтай зале. Больш падрабязна з правіламі можна пазнаёміцца непасрэдна ў бібліятэцы.

На вучэбным абанеменце (III паверх) студэнты атрымліваюць падручнікі. Абслугоўванне вядзецца, як і раней, па факультэтах. Усю манаграфічную, навукова-папулярную, а таксама мастацкую літаратуру можна атрымаць на навуковым абанеменце (II паверх). Калі кнігі не будзе тут, яе патрэбна заказаць, як і раней, з кнігасховішча.

Прафесарска - выкладчыцкі састаў, навуковыя супрацоўнікі і абслугоўваючы персанал карыстаюцца толькі навуковым абанементам. У выпадку, калі ім спатрэбіцца вучэбная літаратура, атрымаць яе можна праз навуковы абанемент, спачатку запоўніўшы бланкзаяўку.

Вопыт двухтыднёвай работы па-новаму паказаў, што, нягледзячы на некаторыя выдаткі, студэнтам намнога спадручней стала працаваць у чытальных залах: цішыня, побач літаратура і г. д., а на абанементах значна паменшылася чарга.

Бібліятэкары ў сваю чаргу робяць усё, каб чытачам у бібліятэцы ствараць добрыя ўмовы для работы. Хацелася б, каб і чытачы праяўлялі асабісты такт і цярпенне і не рабілі паспешлівых адмоўных вывадаў.

Толькі разам мы хутчэй увойдзем у нармальны рытм работы, таму што гэтая форма абслугоўвання для нашай бібліятэкі пакуль што новая, некалькі незвычайная, і, натуральна, ёсць яшчэ шэраг неналаджаных момантаў.

У будучым навучальным годзе бібліятэка мяркуе пайсці далей па шляху дыферэнцыяцыі абслугоўвання чытачоў. Вучэбная літаратура будзе выдавацца строга па групах, што дасць магчымасць да мінімуму скараціць затраты студэнцкага часу.

З. МАКЕЕНКА,
галоўны бібліятэкар БДУ.



У СКВЕРЫ ЯНКІ КУПАЛЫ.
Фота Д. Чаховіча

# ЦІ НАДВОР'Е ВІНАВАТА?..

Сёлетняя зіма дыктуе вельмі складаныя ўмовы для бяспечнага руху. Туманы, снегапады, галалёдзіца робяць больш цяжкай работу вадзіцеляў, патрабуюць ад іх павышэння ўвагі на дарозе.

Усё гэта ў самай непасрэднай ступені датычыцца і пешаходаў. Калі нечаканае паяўленне пешахода на шляху аўтамабільнага руху наогул лічыцца небяспечным, то пры мокрай дарозе яно небяспечна ўдвая. Тармазны шлях машыны ў такія моманты значна ўзрастае.

Мы ж, пешаходы, не заўсёды жадаем лічыцца з гэтым. Прыкладам таму служаць некаторыя даныя Дзяржаўтаінспекцыі. У мінулым годзе 176 студэнтаў універсітэта былі аштрафаваны работнікамі ДАІ на суму ад 3 да 10 рублёў. Пяцёра чалавек на доўгі тэрмін былі адарваны ад вучобы. Пакаранні, як бачыце, розныя, а прычына ўсяму гэтаму адна — няправільны пераход вуліцы.

Звыш сарака дарожна-транспартных здарэнняў на вуліцах горада мелі месца ў мінулым месяцы. Шэсцьдзесят тры чалавекі ў выніку іх раненых, двое—забіты.

І амаль усе гэтыя няшчасці здарыліся пры дрэнных дарожных умовах. Але ці надвор'е вінавата ва ўсім? Пэўна ж, не. Увага, ваша ўвага і дысцыпліна, таварышы пешаходы, служаць найлепшай гарантыяй вашай бяспекі на вуліцы.

Р. АЎРАМЕНКА,
інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома.




Па даўняй традыцыі прозвішчы дзесяці лепшых спартсменаў года будуць занесены ў кнігу гонару спартыўнага клуба БДУ. Першыя прозвішчы ў яе былі запісаны ў 1955 годзе. Многія з іх некалькі гадоў запар не сыходзілі са старонак гэтай кнігі, імі і да гэтага часу ганарыцца спартыўны універсітэт. У ліку лепшых спартсменаў 1972 года названы:

Уладзімір Фралоў (майстар спорту па класічнай барацьбе і цяжкай атлетыцы)

Людміла Кайгародава (лёгкая атлетыка)

Ларыса Вараб'ёва (мастацкая гімнастыка)

Ганна Шлагава (акрабатыка)

Таццяна Надзеева (лёгкая атлетыка)

Вера Васькова (грэбля)

Аляксандр Якаўлеў (лёгкая атлетыка).

●

У лютым мужчынская і жаночая зборныя універсітэта па валейболу сустрэліся ў Вільнюсе ў традыцыйным матчы з камандамі Вільнюскага, Латвійскага, Тартускага і Пражскага універсітэтаў. Каманды БДУ занялі другое месца (мужчыны) і III (жанчыны).

●

Закончылася першынство горада па валейболу. Жаночая каманда універсітэта заняла I месца, сустрэўшыся з камандамі ІФК (3:0) і БІНГ (3:2). На базе яе створана зборная жаночая каманда горада па валейболу, якая выступіла 5—10 сакавіка ў гульнях на першынство рэспублікі па валейболу і заняла другое месца. Восенню каманду чакаюць фінальныя гульні з удзелам каманд майстроў.

●

Паспяхова пачаўся 1973 год для універсітэцкай хакейнай каманды. У лютым яна заняла III месца ў фінале розыгрышу кубка БССР па хакею з шайбай.

У фінал такіх спаборніцтваў каманда трапіла ўпершыню.

●

У канцы лютага закончылася першынство вну БССР па лыжнаму спорту. Каманда БДУ заняла IV месца. У параўнанні з мінулымі вынікамі гэта значны поспех.

●

17 лютага пачалося першынство універсітэта па баскетболу ў праграме XXI спартакіяды БДУ. Прадстаўлены 10 мужчынскіх каманд, 9 жаночых. У фінальныя падгрупы трапілі каманды геафака, гістфака, фізфака, ФПМ (жанчыны), фізфака, матфака, ФПМ, біяфака (мужчыны). Апошні дзень спаборніцтваў — 20 сакавіка. Ужо цяпер можна адзначыць мацнейшыя каманды: геаграфічнага факультэта (жанчыны), фізфака і ФПМ (мужчыны). На жаль, некаторыя факультэты несур'ёзна аднесліся да гэтага мерапрыемства. Юрфак наогул не выставіў жаночую каманду, жаночая каманда матфака выключана за нез'яўленне на гульню — гэта тым больш прыкра, што ў мінулым жаночая каманда матфака на працягу многіх год была ў ліку мацнейшых; знята за нез'яўленне і каманда мужчын геафака.

Т. ЗАСІМ.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2.000 экз.

АТ 06618. Заказ 282